ПРАГРАМА

І АРГАНІЗАЦЫЙНЫ СТАТУТ

БЕЛАРУСКАЕ СЯЛЯНСКА-РАБОТНІЦКАЕ ГРАМАДЫ

БЕЛАРУСКАЯ ДРУКАРНЯ
ІМ. ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ
1926.

Выданьне Цэнтральнага Сэкрэтарыяту Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады.

ПРАГРАМА
Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады.

I. Самаазначэньне народаў і міжнародная солідарнасьць працоўных.

1. Увесь істнуючы лад паміж дзяржавамі і народамі павінен быць перабудованы на аснове поўнага самаазначэньня народаў.

2. Стоючы на груньце самаазначэньня народаў, Б. С.-Р. Грамада лічыць, што ўсе беларускія землі павінны быць злучаны і аб'яднаны ў незалежнай рэспубліцы пад уладаю сялян і работнікаў.

3. Разам з тым Б. С.-Р. Грамада жыва падтрымоўвае сучаснае імкненьне працоўных мас да стварэньня цеснага соцыялістычнага саюзу эўропэйскіх народаў.

4. Згодна з гэтым Б. С.-Р. Грамада вядзе сваю працу ў духу міжнароднай солідарнасьці працоўных.

II. Саюз сялян і работнікаў.

5. Вызваленьне ўсяго працоўнага народу спад ярма капіталу і нацыянальнага ўціску—гэта агульная мэта і супольная справа сялян і работ-

нікаў. Зьдзейсьненьне гэтага магчыма толькі ў цесным саюзе сялян і работнікаў.

6. Працоўная інтэлігэнцыя ў сваей лепшай і здаравейшай частцы павінна прылучыцца да такога саюзу сялян і работнікаў, знаходзячы тут шырокі грунт да прылажэньня сваіх творчых сілаў.

III. Сялянска-Работніцкі ўрад.

7. Толькі цесны саюз сялян і работнікаў можа ўстанавіць сялянска-работніцкі ўрад.

Толькі работніцка-сялянскі ўрад зможа даць прыгнечаным народам волю, сялянам зямлю, работнікам працу і толькі ён зможа перабудаваць народную гаспадарку і ўвесь дзяржаўны і грамадзкі лад на больш разумных і справядлівых падставах ды павясьці народ да лепшае будучыны.

* * *

Вядучы барацьбу за самаазначэньне народаў, за сялянска-работніцкі ўрад, Б. С.-Р. Грамада разам з тым нясупынна змагаецца за самыя палючыя і штодзенныя патрэбы сялян і работнікаў: за зямлю бяз выкупу, процiў непамерных падаткаў, за абарону работніцкіх законаў, за родную школу, за палітычныя свабоды і інш.

* * *

IV. Зямля сялянам бяз выкупу.

8. Усе абшарніцкія і духоўныя землі павінны быць бяз выкупу адабраны ад паноў-абшарнікаў і духавенства і разам з казеннымі праз сялянскія камітэты падзелены паміж мяйсцовымі сялянамі і парабкамі бясплатна.

V. Скасаваньне асадніцтва.

9. Б. С.-Р. Грамада дамагаецца скасаваньня як ваеннага, так і цывільнага асадніцтва.

Увесь зямельны запас Заходняе Беларусі павінен быць падзелены паміж мяйсцовымі сялянамі і парабкамі.

VI. Упарадкаваньне зямлі.

10. Б. С.-Р. Грамада падтрымоўвывае перасяленьне сялян з вёсак на хутары або на пасёлкі, але толькі пры той умове, што малазямельным зробіцца прырэзка зямлі, каб яны маглі вясьці запраўды самастойную гаспадарку.

11. Побач з гэтым Б. С.-Р. Грамада дамагаецца шырокай мэліорацыі—(а перадусім асушкі балот і лугоў) на скарбовы кошт водле шырокага дзяржаўнага пляну.

12. На заспадараваньне пры пераходзе на хутары і пры парцэляцыі павінна быць дадзена патрэбная помач — грашыма, інвэнтарам, будаўлянымі матэрыяламі.

13. Б. С.-Р. Грамада дамагаецца шырокай агранамічнай помачы і таннага крэдыту для сялянства.

14. Усе работы па земляўпарадкаваньню павінны быць аднесены на скарбовы кошт.

VII. Лясы і воды

15. Таксама як землі, усе дворныя і духоўныя лясы і воды павінны перайсьці на ўласнасьць дзяржавы.

16. Грамада дабіваецца, каб сяляне былі забясьпечаны лесам на будоўлю і апал, а таксама пашай для жывёлы.

17. Б. С.-Р. Грамада вядзе барацьбу проціў такога касаваньня сэрвітутаў, што крыўдзіць сялян на карысьць паноў-абшарнікаў.

VIII. Падаткі.

18. Падаткі гнятуць працоўны народ невынасімым цяжарам. Яны разложаны несправядліва і зьбіраюцца спосабам нязносна цяжкім і руйнуючым для сялянства.

Б. С.-Р. Грамада дабіваецца, каб падаткі былі пераложаны на пануючыя заможныя клясы, а з беззямельных, малазямельных і сераднякоў былі зусім зьнятыя.

Мераю для ападаткаваньня павінен быць даход.

19. Б. С.-Р. Грамада дамагаецца, каб былі скасаваны ўсе пасярэдныя (ўкосныя) падаткі, асабліва-ж налогі на прадметы першае патрэбы.

20. Незалежна ад гэтага Б. С.-Р. Грамада дамагаецца безадкладнага ўвядзеньня адзінага падатку, — значыць, каб падатак вызначаўся раз у год на адным платным наказе з разлажэньнем на раты і з выразным вызначэньнем тэрміну.

IX. Работніцкія законы.

21. Б. С.-Р. Грамада бароніць усе соцыяльныя заваёвы работнікаў. Паміж іншым яна вядзе барацьбу за: 1) 8-гадзінны рабочы дзень, нядзельны адпачынак і платныя водпускі, 2) забарону працы дзяцей і палепшаньне санітарных варункаў працы на фабрыках, 3) мінімум заработнай платы, 4) дзяржаўнае страхаваньне работнікаў гораду і вёскі ад хваробы, калецтва, безработцьця і на старасьць; 5) свабоду стачак і поўную свабоду профэсіональных саюзаў, 6) законнае прызнаньне фабрычных работніцкіх камітэтаў з правам учасьця ў наглядзе за прадукцыяй.

22. Уважаючы, што кожнаму работніку вёскі і гораду дзяржава павінна забясьпечыць працу і заработак, Б. С.-Р. Грамада ў часе сучаснага цяжкога безработцьця ў горадзе і вёсцы дамагаецца:

а) выплаты безработным гораду і вёскі дапамог у разьмеры пражытачнага мінімума;

б) безадкладнай арганізацыі шырокіх публічных работ;

в) арганізацыі камітэтаў безработных.

X. Коопэрацыя.

23. Б. С.-Р. Грамада вялікую ўвагу зьвяртае на пашырэньне спажывецкай, вытворчай і крэдытнай коопэрацыі сярод сялян і работнікаў, уважаючы, што яна дае магчымасьць працоўнаму народу бараніцца ад дарагоўлі і спэкуляцыі, ды прывучае яго да арганізаванай самадзейнасьці. Вядучы барацьбу проціў падпарадкаваньня коопэрацыі інтэрэсам абшарнікаў і капіталістаў, Б.

С. Р. Грамада дамагаецца для коопэрацыі шырокага дзяржаўнага крэдыту.

XI. Самаўрады.

24. Усе самаўрады гмінныя, павятовыя і ваяводзкія павінны выбірацца агульным галасаваньнем усяго працоўнага народу, а не назначацца адміністрацыяй (старостай, ваяводай).

Самаўрады павінны быць унезалежнены ад адміністрацыі, а круг дзеяльнасьці іх павінен быць пашыраны.

25. Адною з важнейшых галін самаўрадавай працы павінна быць забясьпечаньне вёсцы бясплатнай мэдыцынскай помачы, забясьпечаньне апекі над сіротамі, бездагляднымі калекамі і старымі, а також забясьпечаньне неабходным матар'ялам (з грашоваю дапамогаю ад скарбу) на адбудову ўсіх зьнішчаных падчас вайны гаспадарак.

26. Б. С.-Р. Грамада выступае проціў усялякіх самаўрадавых, ці іншых натуральных павіннасьцяў.

XII. Войска, паліцыя, адміністрацыя.

27. Б. С.-Р. Грамада дабіваецца скарочаньня службы ў войску і значнага паменьшаньня войска, паліцыі і адміністрацыі, каб такім спосабам паменшыць ападаткаваньне насяленьня і павялічыць выдаткі на культурныя патрэбы.

28. Б. С.-Р. Грамада вядзе барацьбу з палітыкай мілітарызму і імкнецца да замены сталай арміі народнай міліцыяй.

29. Б. С.-Р. Грамада змагаецца, каб паліцыя і ўрадоўцы, не выключаючы й міністраў, адказвалі перад законам за службовыя надужыцьці.

Паміж іншым Б. С.-Р. Грамада дамагаецца скасаваньня палітычнай паліцыі і вядзе барацьбу з сыстэмаю біцьця і правакацыі.

XIII. Палітычныя свабоды.

30. Б. С.-Р. Грамада змагаецца за поўную свабоду сходаў, друку і слова, за свабоду палітычных і эканамічных організацыяў для сялян, работнікаў і працоўнае інтэлігэнцыі.

31. Б. С.-Р. Грамада вядзе барацьбу проціў усялякіх пісаных і няпісаных прывілегіяў для пануючых клясаў — абшарнікаў і буржуазіі.

32. Б. С.-Р. Грамада змагаецца з рознымі спробамі пагоршыць істнуючыя законы (напрыклад, выбарны закон).

33. Б. С.-Р. Грамада дабіваецца поўнае свабоды ўстраіваць веча і іншыя сходы.

34. Б. С.-Р. Грамада дамагаецца скасаваньня выняткавага стану і даразных судоў, істнуючых на Заходняй Беларусі.

35. Б. С.-Р. Грамада дамагаецца амністыі для ўсіх палітычных.

36. Б. С.-Р. Грамада дамагаецца права свабоднай апекі над палітычнымі вязьнямі.

37. Б. С.-Р. Грамада дамагаецца скасаваньня кары сьмерці.

XIV. Суды.

38. Б. С.-Р. Грамада стаіць за народны суд, які мае выбірацца самым народам з мяйсцовых людзей, а тымчасам дамагаецца безадкладнага ўвядзеньня суду прысяжных.

39. Грамада вядзе барацьбу проціў сыстэмы тайных судоў („пры зачыненых дзьвярох“) і бароніць незалежнасьць судоў ад уплываў палітычнай паліцыі.

XV. Школа.

40. Б. С.-Р. Грамада стаіць за ўвядзеньне адзінай працоўнай школы з бясплатным навучаньнем — на кошт дзяржавы — для працоўных элемэнтаў (сялян, работнікаў, працоўнае інтэлігэнцыі).

41. Б. С.-Р. Грамада дамагаецца пашырэньня агранамічнага і наагул профэсыянальна-тэхнічнага навучаньня.

42. Навука ўва ўсіх дзяржаўных школах павінна вясьціся ў роднай мове вучняў.

43. Б. С.-Р. Грамада выступае проціў таго, што школьныя ўлады вымагаюць ад вучыцялёў паліцэйскіх пасьведчаньняў маральнасьці (świadectwo moralności) пры паступленьні на службу. Гэта бяспраўна — бяз суду — агранічвае правы грамадзян вучыцялёў і робіць іх залежнымі ад самаволі палітычнае паліцыі.

XVI. Мова.

44. Кожнай нацыянальнасьці павінна быць забясьпечана магчыма найшырэйшае права карыстацца ўласнаю моваю ў дзяржаўным і грамадзкім жыцьці.

45. Б. С.-Р. Грамада будзе змагацца за поўную свабоду пашырэньня культурна-прасьветнае дзейнасьці ў роднай мове: бібліятэк, чытальняў, краязнаўчых гурткоў, тэатраў і т. д.

XVII. Рэлігія.

46. Прызнаючы поўную свабоду сумленьня, Б. С.-Р. Грамада стаіць за аддзяленьне царкві (касьцёлу) ад дзяржавы і ад палітыкі.

47. Б. С.-Р. Грамада змагаецца з выкарыстваньнем веры—царквы ці касьцёлу—да палітычных мэтаў, напрыклад дзеля падтрыманьня пануючых клясаў або дзеля полёнізацыі ці русыфікацыі.

48. Б. С.-Р. Грамада будзе таксама змагацца з сеяньнем рэлігійнае ці расавае барацьбы і ненавісьці.

XVII. Проціў нацыянальнага ўціску і руйнаваньня краю.

49. Б. С.-Р. Грамада дамагаецца запраўдных роўных правоў у жыцьці — а ня толькі на паперы—для ўсіх грамадзян, незалежна ад веры ці нацыянальнасьці.

Паміж іншым Грамада дамагаецца: а) безадкладнага прызнаньня правоў грамадзянства (obywatelstwo) для ўсіх жыхароў Заходняе Беларусі;

б) інвалідзкае рэнты для ўсіх ваенных інвалідаў, іхных удоў і сірот;

в) свабоднага доступу на ўрадовую службу для мяйсцовых людзей, незалежна ад веры, нацыянальнасьці ці палітычных поглядаў.

50. Вядучы барацьбу проціў непамернага вызыску нашага краю так польскімі як і заграничнымі капіталістымі, асабліва-ж проціў рабунковага вырубаньня і распрадажы нашага прыроднага багацьця, лясоў, проціў распрадажы фабрык і абарудаваньня заграніцу, вядучы барацьбу з усімі відамі колёнізацыі Заходняе Беларусі, Грамада дамагаецца поўнага разьвіцьця ўсіх гаспадарчых сіл і магчымасьцей краю.

* * *

51. Ідучы да сваіх мэтаў, Б. С.-Р. Грамада карыстаецца шляхам легальнай, законнай барацьбы на аснове конституцыі і права.



Арганізацыйны Статут Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады.

Сябры Грамады.

1. Сябром Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады можа быць кожны селянін, работнік і працоўны інтэлігент, які—ведаючы добра праграму Грамады — ня толькі згаджаецца з гэтаю праграмаю, але стала і становучa гатоў працаваць над стварэньнем сьвядомай сарганізаванай сялянска-работніцкай сілы і пачувае сябе гатовым на ўсякія труды, з працай гэтай зьвязаныя.

2. Абавязкам кожнага сябра Грамады зьяўляецца:

а) выконаваць усялякія арганізацыйныя распараджэньні, атрыманыя ад партыйных ўладаў, а таксама прыймаць партыйныя становішчы, на якія будзе выбраны;

б) аплачаваць партыйную складку, разьмер якой вызначае сам паводле ўласнага разуменьня і магчымасьці;

в) чытаць і аплачаваць газэты, выдаваныя Грамадой, а таксама пастаянна знаходзіць для іх новых чытачоў і падпішчыкаў;

г) мець партыйны білет.

3. Кожны сябра Грамады мае права:

а) прыймаць учасьце на сходах і зьездах Грамады;

б) выбіраць і быць выбіраным на ўсе становішчы ў партыйнай арганізацыі.

4. Сябры Грамады прыймаюцца мяйсцовай арганізацыяй або вышэйшымі партыйнымі ўладамі.

5. Ніхто з сяброў Грамады ня можа належаць да іншых палітычных партыяў. Калі-б гэта сталася, дык такі сябра аўтаматычна выключаецца з Грамады.

6. Калі-б хто з сяброў Грамады ня выканаў без даведзенай прычыны якога-небудзь з прынятых на сябе абавязкаў або запляміў-бы сябе паступкам, паніжаючым годнасьць чалавека працы, дык гэткі сябра на пэўны час пазбаўляецца правоў сябра Грамады або зусім выключаецца з партыі. Пазбавіць правоў сябра Грамады можа кожная мяйсцовая арганізацыя. Выключыць з Грамады мае права толькі Цэнтральны Камітэт. Гэтае сваё права Цэнтральны Камітэт можа перадаваць і даручаць іншым партыйным уладам.

Пазбаўлены на пэўны час правоў сябра Грамады мае права ў працягу месяца абжалаваць пастанову мяйсцовай арганізацыі ў Цэнтральны Камітэт, які і вырашае тады аканчальна гэтую справу.

Мяйсцовая арганізацыя.

7. Сябры Грамады, якія пражываюць ў адной ці некалькіх суседніх вёсках, ствараюць партыйны Гурток. У вялікіх мястэчках і гарадох

районныя Гурткі Грамады могуць лучыцца ў адзіную Гарадскую арганізацыю Грамады.

8. Гурток выбірае свой Камітэт, складзены з трох асоб: старшыні, сэкрэтара і скарбніка. Камітэт выступае ад імя Гуртка, згодна з пастановамі Гуртка або згодна распараджэньняў вышэйшых партыйных уладаў.

9. Сходы Гуртка адбываюцца ў меру патрэбы і склікаюцца з уласнай ініцыятывы Камітэту, на жаданьне трох сяброў Гуртка або на жаданьне вышэйшай партыйнай улады.

10. Да кампетэнцыі Гуртка належыць:

а) прыймо сяброў і пазбаўленьне іх правоў;

б) выбар дэлегатаў на партыйныя зьезды і Агульны Зьезд;

в) зьбіраньне складак, партыйных ахвяраў і падпіскі ад сяброў на газэту;

г) вызначэньне для Камітэту і паасобных сяброў Гуртка прац арганізацыйна-агітацыйных, асабліва-ж працы ў пашырэньні партыйных друкаў і ў знаходжаньні новых падпішчыкаў газэты;

д) прыйманьне справаздачаў аб дзеяльнасьці Камітэту і паасобных сяброў Гуртка;

е) вызначэньне кандыдатаў у гмінную раду, касу хворых, а таксама ў-ва ўсякія мяйсцовыя таварыствы прасьветныя, гаспадарчыя і грамадзкія;

ж) разважаньні над палітычнымі справамі і прыйманьне пастановаў як агульных, так і ў справах мяйсцовага характару.

11. Адказным перад партыяй за працу Гуртка зьяўляецца Камітэт Гуртка.

Павятовая арганізацыя.

12. Сябры Грамады, якія жывуць у адным павеце, складаюць арганізацыю Грамады данага павету.

13. Сябры Грамады зьбіраюцца ня меньш аднаго разу ў год на Павятовы зьезд.

14. Павятовы зьезд Грамады склікаецца Павятовым Камітэтам па:

а) пастанове Павятовага Камітэту;

б) жаданьню вышэйшай партыйнай улады;

в) жаданьню найменьш трох партыйных Гурткоў.

15. Павятовы зьезд

а) выбірае Павятовы Камітэт у складзе старшыні, сэкрэтара, скарбніка і па адным сябру Камітэта ад кожнага Гуртка;

б) прыймае справаздачу аб дзеяльнасьці Камітэту;

в) разважае справы палітычныя і выносіць у гэтых справах свае пастановы.

г) выбірае дэлегатаў на партыйны Агульны Зьезд.

16. Засяданьні Павят. Камітэту вызначаюцца:

а) пастановай папярэдняга засяданьня;

б) старшынёй Камітэту з уласнай ініцыятывы або на жаданьне двух сяброў Камітэту;

в) на жаданьне вышэйшай партынай улады.

17. Да абавязкаў Павятовага Камітэту належыць:

а) падгатовка і скліканьне павятовых зьездаў;

б) кантраляваньне дзеяльнасьці мяйсцовых Гурткоў і прэзідыуму Камітэту;

в) выконаваньне пастановаў зьездаў;

г) арганізаваньне мітынгаў і палітычных нарадаў, кіраваньне палітычнай акцыяй на абшарах павету ў мэтах паглыбленьня сьвядомасьці беларускіх сялянскіх і работніцкіх масаў і пашырэньня арганізацыі;

д) складаньне Цэнтральнаму Камітэту квартальных (4 разы ў год) справаздач аб партыйнай дзеяльнасьці, а таксама аб палітычным, культурным і гаспадарчым жыцьці ў павеце.

18. Пастановы Камітэту выконывае прэзідыум у складзе старшыні, сэкрэтара і скарбніка. Прэзідыум павінен утрымліваць сталую сувязь з Камітэтамі Гурткоў і з Цэнтральным Камітэтам. Прэзідыум выдаець сяброўскія білеты; кантралюе падпіску на газэту і сяброўскія складкі, а таксама кантралюе пашыраньне партыйных друкаў.

Адказным перад Цэнтральным Камітэтам за стан працы ў павеце зьяўляецца прэзідыум; прэзідыум падаець Цэнтральнаму Камітэту кожны месяц сьпіс усіх сяброў Грамады ў павеце.

Акружная арганізацыя.

19. Цэнтральны Камітэт, калі знойдзець патрэбным, стварае Акружныя Арганізацыі Грамады, злучаючы ў іх па некалькі павятовых арганізацый.

Агульны зьезд.

20. Найвышэйшай уладай Грамады зьяўляецца Агульны Зьезд. Агульны Зьезд пастанаўляе аб усей палітычнай і арганізацыйнай дзеяль-

насьці Грамады, а таксама аб праграме, тактыцы і статуце, выбірае Цэнтральны Камітэт і Рэвізыйную Камісію Грамады, а роўна прыймае ад іх справаздачу.

21. Агульны Зьезд складаецца з дэлегатаў, выбраных ад Гурткоў, а таксама на павятовых зьездах, і склікаецца Цэнтральным Камітэтам ня меньш аднаго разу ў год. На жаданьне найменш 7 арганізацый павятовых (зьездаў ці павятовых камітэтаў) Цэнтральны Камітэт абавязаны склікаць Агульны Зьезд у працягу трох месяцаў.

Цэнтральны Камітэт.

22. Цэнтральны Камітэт кіруе дзеяльнасьцю Соймавага Клюбу, Павятовых Камітэтаў і ўсіх іншых арганізацый Грамады.

23. У выпадку пільнай патрэбы выявіць становішча ўсяе Грамады ў паасобных справах,— Цэнтральны Камітэт склікае Раду Грамады, складзеную з прадстаўнікоў Павятовых Камітэтаў і мужоў даверыя.

24. Цэнтральны Камітэт складаецца з 11 сяброў і выбірае з-паміж сябе прэзідыум у складзе 5 асоб, у гэтай лічбе старшыню, віцэ-старшыню, скарбніка, сэкрэтара і яго заступніка.

25. Засяданьні Цэнтральнага Камітэту адбываюцца ў меру патрэбы і склікаюцца старшынёю з яго ініцыятывы, па пастанове прэзідыуму або на жаданьне трох сяброў Камітэту.

26. Для вядзеньня паасобных галін працы Цэнтральны Камітэт стварае аддзелы і выбірае з лічбы сяброў Камітэту кіраўнікоў гэтых аддзелаў.

27. Засяданьні Прэзідыуму Ц. К. адбываюцца раз на тыдзень. На свае засяданьні Прэзідыум мае права запрашаць кіраўнікоў паасобных аддзелаў.

Рэвізыйная Камісія.

28. Рэвізыйная Камісія складаецца з трох сяброў і аднаго заступніка, якіх выбірае Агульны Зьезд Грамады.

29. Рэвізыйная Камісія спраўджае прыходарасходную кнігу Цэнтр. Камітэту і робіць справаздачу на Агульным Зьездзе Грамады.

Фінансы Грамады.

30. Фінансы Грамады складаюцца:

а) з сяброўскіх складак;

б) са складак пасольскіх;

в) з даходаў ад продажы партыйнае літэратуры;

г) з ахвяраў і даходаў надзвычайных.

31. Палова сяброўскіх складак застаецца ў арганізацыі мяйсцовай ці павятовай, другая-ж палова адсылаецца ў Цэнтральны Камітэт.

32. Павятовыя зьезды маюць права ўстанаўляць дадатковыя складкі на спэцыяльныя мэты.

Пастановы.

33. Пастановы ўсіх партыйных уладаў і сабраньняў прыймаюцца звычайнай большасьцю галасоў. Пастановы-ж Агульнага Зьезду адносна праграмы, ці тактыкі або Статуту Грамады вымагаюць большасьці $^2/_3$ галасоў дэлегатаў, прысутных на Агульным Зьезьдзе.

Пераходныя правілы.

34. Да часу сабраньня першага Агульнага Зьезду Грамады Цэнтральны Камітэт выбіраецца Радаю Грамады.

35. У тых паветах, дзе яшчэ ня створаны мяйсцовыя Гурткі і ня выбраны яшчэ Павятовыя Камітэты, вядуць арганізацыйную працу мужы даверыя Грамады, вызначаныя Цэнтральным Камітэтам і перад ім адказныя.

36. Гэты Арганізацыйны Статут Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады зацьверджаны на засяданьні Рады Грамады 12. V. 1926 году і зьяўляецца абавязковым для ўсіх сяброў Грамады да часу склікаяньня першага Агульнага Зьезду Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады.